Цана асобнага нумару 20 гр.

Pierasyłka apłačana gotoŭkaj

№ 21 Вільня, Чацьвер 18 чэрвеня 1931 г. Год VII (XV)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрас Рэдакцыі і Адміністрацыі: ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)

Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран. да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел КРЫНІЦА" каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй.

ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Канфіската „Беларускай Крыніцы".

Па загаду адміністрацыйнай улады дня 16. VI. с. г. сканфіскаваны № 20 „Бел. Крыніцы" з дня 17-га г. м. за стадцьцю „Польскія Жодзішкі ў Латвіі".

У гэтым нумары зьмяшчаем увесь матэр'ял № 20, пакідаючы месца сканфіскаванай стацьці пустым.

Ілжа „Бел. Звону" прад Маршалкоўскім Судом.

Пратакол

з дня 5 чэрвеня 1931 г. **Маршалкоўскага Суду** зложанага з паслоў Міхала Руга, як супэрарбітра, Норбэрта Барліцкага і Др. Яраслава Олесьніцкага, як арбітраў—у ганаровай справе пасла Алексага Яворскага процiў пасла Фабіяна Ярэміча.

Прысутныя: успомненыя вышэй сябры Суду і абедзьве стараны.

Старшыня п. Руг дае голас п. Ф. Ярэмічу, каторы гаворыць наступнае: П. А. Яворскі закінуў мне ў прысутнасьці паслоў Луцкага і Др. Загайкевіча, што ў газэце „Беларускі Звон" з дн. 10 красавіка 1931 г. № 8 паявіўся артыкул, у якім гаворыцца, што я браў ад Ураду на газэту „Сялянская Ніва" запамогі па 3.000 зл. месячна, а такжа, што я даносіў на п. А. Луцкевіча, у выніку чаго быў ён арыштаваны. Дзеля таго, што ў цэлым гэным артыкуле, ганьбячым мяне, няма ані слова праўды, — паслаў я да рэдактара „Беларускага Звону" сьведкаў у асобах п. п. Вячэслава Багдановіча і Язэпа Найдзюка з дамаганьнем адклікаць зьневажаючы мяне артыкул, што зрабіць тойжа адмовіўся; дзеля гэтага названыя вышэй сьведкі сьпісалі пратакол з дн. 22 красавіка 1931 г., які быў надрукаваны ў газэце „Беларуская Крыніца" з дн. 29 красавіка 1931 г. № 31. Абодва нумары ўспомненых газэт тут прадстаўляю і жадаю ад пасла Алексага Яворскага сатысфакцыі за тое, што публічна паўтарыў зьмест успомненага вышэй, зьняважаючага мяне артыкулу.

Далей Старшыня дае голас п. Алексаму Яворскаму, каторы заяўляе, што прачытаўшы ўспомнены артыкул „Беларускага Звону", уважаў за адпаведнае запытацца п. Ярэміча ў прысутнасьці сьведкаў што да закідаў зробленых яму ў гэным артыкуле, тымбольш, што п. Ярэміч ёсьць госпітантам Украінскага Соймавага Клюбу, якога сябрам зьяўляецца і сам п. Яворскі. Уважае, што п. Ярэміч павінен ачысьціцца з тых закідаў, прычым дадае, што аб пратаколе, сьпісаным процiў рэдактара „Беларускага Звону", яшчэ ня ведаў.

З свайго боку прапануе прасіць на сьведку б. Віленскага Ваяводу, а цяперашняга Маршалка Сэнату, п. Рачкевіча, які-б выказаў, ці закіды, зробленыя ў успомненым артыкуле п. Ярэмічу, маюць пад сабой якую падставу.

Далей Суд, па нарадзе, у няприсутнасьці старон, пастанавіў аднагалосна:

1. Прызнаць, што Пратакол сьпісаны п.п. В. Багдановічам і Я. Найдзюком ёсьць ужо падставай дзеля вырашэньня справы ў тым значэньні, што ськіраваныя процiў п. Ярэміча закіды зьяўляюцца безпадстаўнымі, калі адказны рэдактар не хацеў ані выявіць іх аўтара, ані даць якоганебудзь выясьненьня, да чаго быў бадай маральна забавязаны.

2. З увагі, што да поўнага выясьненьня справы маглі-б прычыніцца паказаньні п. Марш. Рачкевіча, а такжа з увагі, што пакліканая старана г. зн. п. Яворскі дамагаецца паказаньня апошняга — пастанавіў дапытаць, як сьведку, п. Маршалка Рачкевіча, ці яму, як б. Віленскаму Ваяводзе ў часе, да якога адносяцца ськіраваныя процiў п. Ярэміча закіды, ёсьць што аб гэтым ведама, што падобныя факты маглі-б мець месца.

Дзеля таго, каб выслухаць паказаньні гэтага-ж сьведкі, адложана расправа на дзень 6 чэрвеня 1931 г. гадз. 12 ўпаўдні, што старонам абвешчана. Падпісалі:
(—) Міхал Руг: ул. р., (—) Норбэрт Барліцкі ул. р., (—) Др. Яраслаў Олесьніцкі ул. р.

Пратакол паседжаньня Суду з дня 6 чэрвеня 1931 г. Прысутныя сябры Суду, як вышэй. Зьявіліся: п. Фабіян Ярэміч асабіста; за п. А. Яворскага паўнамоцнік яго п. Уладзімер Касацкі, які прадстаўляе паўнамоцтва з датай: Варшава, дн. 5. чэрвеня, 1931 г. Па зрэасумаваньні вынікаў папярэдняй расправы, прыступілі да дапросу сьведкі п. Маршалка Ўладыслава Рачкевіча, катораму старшыня падае да ведама зьмест успомненага артыкулу „Беларускага Звону". Сьвед-

ка Уладыслаў Рачкевіч па стасоўным упамненьні кажа: быў я ваяводай у Вільні ў гадох ад 1925 да 1930. Ведама мне, што выходзіла тады там часопісь „Сялянская Ніва“, але няведама мне нічога аб тым, каб п. Ярэміч сам ці за пасрэдніцтвам кагонебудзь атрымліваў ад ураду якіясь субвэнцыі на гэную часопісь. Таксама нічога мне няведама, каб п. Ярэміч атрымліваў ад ураду субвэнцыі на якія іншыя мэты. Калі-б так было сапраўды, я, як ваявода, ведаў-бы аб гэтым. — Далей просіць голасу паўнамоцнік п. А. Яворскага п. Касаноцкі і падае да ведама наступнае: з увагі на вынікі праведзенай расправы, асабліва-ж з увагі на паказаньні клясычнага сьведкі п. Маршалка Рачкевіча, уважаю справу за высьветленую ў тым сэнсе, што закіды, зробленыя п. Ярэмічу ў інкрымінаваным артыкуле „Беларускага Звону“, уважаю за цалком беспадстаўныя і ачарняючыя, што я паўтарыў іх у добрай веры без намеру зьняважыць п. Ярэміча, цяпержа адклікаю гэныя закіды і перапрашаю п. Ярэміча, калі-б ён чуўся пакрыўджаным з майго боку. — Далей заяўляе п. Фабіян Ярэміч: Прыймаючы пад увагу сказанае п. А. Яворскім, уважаю гэтую справу за скончаную цалком ганарова, а адначасна прашу Суд выдаць мне копію ўсяго Пратаколу расправы. — На гэтым паседжаньне Суду зачынена. — Суд па нарадзе сьцьвердзіў, што справа ёсьць зьліквідаваная. Падпісалі: (—) Міхал Руг ул. р., (—) Норбэрт Барліцкі ул. р., (—) Др. Яраслаў Олесьніцкі ул. р.

За згоднасьць з арыгіналам:

Міхал Руг.

—о—

Ад рэдакцыі: Гэтак скончылася ілжывая напасьць „прожондовэй“ газэты „Бел. Звон“ (10.IV.1931, № 8 і 12. V.1931, № 11) на пасла **Ф. Ярэміча**, а ўбочна і кс. А. Станкевіча.

Вынік Маршалкоўскага Суду дасканальна малюе прад грамадзянствам маральны воблік фактычных рэдактароў санацыйнага „Бел. Звону“. Праўда, беларускае грамадзянства даўно аб іх ведае, але апошнім часам пазналася на іх і лепшая частка грамадзянства польскага. Так напр. „Robotnik“ (7.VI.1931, № 203) з прычыны выніку Маршалкоўскага Суду, зазначыўшы, як „адна беларуская газэтка, выдаваная санацыйнай беларускай групай (п. п. Луцкевіч, Астроўскі і інш.)“ ачарніла пасла Ф. Ярэміча, так канчае свае аб гэтым увагі: „Астаецца нам толькі падчоркнуць — кажа „Robotnik“ — што спосабы палітычнай барацьбы застасаваныя ў даным выпадку проціў пасла Ярэміча, зьяўляюцца спосабамі маральна недапушчальнымі з кожнага пункту гледжаньня. Людзі, ужываючыя гэткіх спосабаў, становяцца за рамамі чэсных палітычных праціўнікаў“.

Урэшце мусім адзначыць, як характэрна да сваей сьведамай ілжы аднёсься „Бел. Звон“ (№ 13, 11. VI. 1931), які заяўляе, што гэныя свае ілжывыя закіды цяпер ужо „бярэ назад“. Вось-жа мусім адзначыць, што гэна лебядзіная песьня „Бел. Звону“ цалком спозьненая, бо паявілася яна толькі тады, калі яго ілжу выказаў Высокі Суд Маршалка Сойму.

З газэт.

І дзе ён навучыўся гэтак лгаць.

Польская газэціна „Наш Пшыяцель“ у № 22 з 31.V.31. палемізуючы з грам. Анісько, які дамагаўся ў імя справядлівасьці ўвядзеньня беларускай мовы ў касьцёлы там, дзе народ гаворыць пабеларуску, кажа, што там, дзе была ўведзена беларуская мова (Жодзішкі, Барадзенічы і інш.) запанаваў камунізм...

Ну, ну, дагаварыўся-ж супрацоўнік „Пшыяцеля“! Дык выглядае так, што беларуская мова вядзе да камунізму, а польская ад яго адводзіць! А якраз у Польшчы, дзе гавораць папольску, найболей пашыраны камунізм (напр. Домброва, Варшава, Лодзь), а і ў нас, па тых парахвіях, дзе сядзяць ксяндзы палякі і распінаюцца за Польшч, якраз найболей пашыраны камунізм! А наадварот, у Жодзішках і Барадзенічах, дзе былі ўведзены, а потым груба выкінуты з касьцёла беларускія навукі, камунізму няма сусім. Дык дзеж ты гэтак навучыўся лгаць „Наш Пшыяцелю?“ Паглянь, на каго галасавалі твае гадунцы і чытачы, ці не на „Стронніцтво Хлопске?“

„Przegląd Wilenski“ аб беларусах.

„Przegląd Wilenski“ (№ 11, 31.V.1931) зьмяшчае стацьцю „Niedomagania życia białoruskiego“, аўтар якой, імкнучыся абяліць „нашых“ санатараў, якія (Луцкевіч і Астроўскі) быццам „zawiedzieni w swych oczekiwaniach, nie chcieli zbytnio się angażować w politykę ugodową“ — піша яўныя, — каб не сказаць больш — баламуцтвы. Вось-жа знаходзім у гэтай стацьці такія красачкі, што ўся барацьба, якую вядуць беларускія незалежніцкія палітычныя групы з беларускай угодай — гэта быццам „nie jako starcie określonych prądów ideowych, lecz jako stare porachunki niektórych przywódców, którzy jeszcze w 1925 r. zapoczątkowali w życiu politycznem Białorusinów rozłamy“... З гэтага выглядае, што Беларуская Хрысьціянская Дэмакрацыя, камуністы, угадоўцы—санатары, — гэта нешта адно, рожніцу між імі твораць толькі палітычныя павадыры дзеля нейкіх асабістых мэтаў. Вось-жа нас саўсім ня дзівіць, што гэткую бязглуздзіцу можа напісаць які малаграматны, а пры тым можа йшчэ беларускай санацыяй наняты інфарматар, але што рэдактар гэткія „інфармацыі“ аб беларускім руху зьмяшчае, — астаецца толькі дзівіцца!... З.

З Беларускага жыцьця.

Новы гурток Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры заснаваўся ў в. Ксяны, Віл.-Троцкага пав.

„Крышку“ ня так. „Бел. Звон“ (11.VI. 1931), распісваючыся шырока аб уваходзе Кс. Ад. Станкевіча, В. Багдановіча ў Бацькаўскі К-т Віленскай Бел. Гімназіі, між іншым падчорківае, што „для супольнай абароны гімназіі былі ўведзены ў прэзыдыюм і прадстаўнікі хадэцкае меншасьці — кс. Станкевіч і Багдановіч.“ Восьжа асобы гэтыя былі ня „ўведзены,“ а **выбраны** і зьяўляюцца не прадстаўнікамі меншасьці, а большасьці, бо абодва яны атрымалі **найбольшы лік галасоў.**

Матура ў Віл. Бел. Гімназіі. З 25 дапушчаных да экзаменаў, атрымалі атэстат сьпеласьці **21.**—14.VI. ў будынку гімназіі адбылося ўрачыстае разьвітаньне матурыстаў з вучыцелямі, на якім выступалі з прамовамі пэдагогі (дыр. Міхалевіч, Астроўскі, кс. Станкевіч, Грышкевіч і інш.) і вучні (Смаленскі, Быхавец, Багдановіч і інш.).

Прадстаўленьне-вечарына, арганізаваная Беларускім Студэнскім Саюзам. адбудзецца ў суботу дня 20-га г. м. у салі Віленскай Беларускай Гімназіі (Вострабрамская 9). У праграме: „Змагары за ідэю“ п‘еса ў трох актах, 2. скокі Пачатак а гадзіне 19 м. 30.

Далейшы развал „Цэнтрасаюзу“. Так званы беларускі „Цэнтрасаюз“, створаны са-

---

W. A.

Adam i Anielka. 4)

V. Jak stary Michał Jakubiel radziŭsia z žonkaj Karusiaj.

— Wiedaješ, Karusia, naš Adam niešta zadumaŭ; ad šlachcianki atkazaŭsia, chaty nia piłnuje, u haspadarcy lanujecca...

— I što jamu zrabiłasia? hetakaja bahataja, charošaja, a jon nia choča, — kaža Karusia.

— Widziš, ty durnaja, ničoha nia wiedaješ, a tut wun što.

— A što?

— Dy taja Treciačyška, što ŭ nas žała, kab joj dna nia było! jana jaho padmanuła.

— A moj ty Michałačka, što ty kažaš, heta musić tolki plotki, abo napaści na jaho.

— Ja tabie kazaŭ, što ty durnaja, dyk ty jašče nia wieryš. Ale hetaha nia budzie! Kab ja tak z hetaha miejsca nia ŭstaŭ, kali jana ŭ maju chatu ŭwojdzie! Dziwicisia ludzi! ciž heta być moža, kab „Hančaki“ z nami ŭ familiju miašalisia? kab im dna nia było!

— Moj Adamka, synok najmilejšy! a jaž tak jaho z Ameryki wyhladała, — zachlipała Karusia.

— Što mnie z jaho za karyść, što jon Amerykaniec? ja kažu jamu: daj, synku, kolki rubloŭ, mnie treba nowyja boty, a jon, ty moža dumaješ, daŭ? Kaža: „u taty swaje hrošy jość.“ A ty, kažu jamu, dyk čužy ŭ nas, ci što? Značyć, jon choča sam tut być panam u majej chacie, dy ŭwieści siudy Treciačyšku biez pasahu i z takoj pahanaj familii. Budź jon sam car amerykanski, dyk nie chaču znać ni jaho, ni jahonaj praklataj Treciačyški.

Słuchaj Michał...

— Što maju słuchać, ty staraja, durnaja baba, wot što! Ci ty nia widziš, što jon tak časta wychodzić z chaty: heta jon u jaje prapadaje, a haspadarku hubić. A ty pawinna wiedać, što my majem jašče dwoje dziaciej: Franuk užo dziaciuk i Kastusia pad dzieŭku padbirajecca. Hdzież ja joj waźmu na ŭbiory, na pasah, kali Amerykaniec z swajej Treciačyškaj ŭssiadajucca na mianie?

Staraja wycirała ślozy, smarkałasia ŭ fartuch i nie hawaryła ničoha, bo stary pośle hetakaj hutarki nie ciarpieŭ babskaj supraciŭnaści, i — prahawary jana choć słoŭka, — biez łupcawańnia nie abyšłosia-b. Treba, bačycie, znać mužčynskuju naturu: kali hetaki had razhamanicca, dyk dziaržy, baba, jazyk za zubami, a kali chočaš adhryźcisia, dyk piłnuj klamki, kab u paru wyskačyć na dwor.

Paradziŭšysia hetak sa staroju, Michał doŭha jašče łajaŭsia, marmataŭ sabie pad nos, plawaŭ i pośle da Amerykanca nie prahawaryŭ dni try ani słowa. A toj ničoha. U haspadarcy byŭ akuratny, nawiet u babskaj rabocie chwataŭsia matcy pamahać, pakul siastra spała. Da času ciarpieŭ i ŭstupaŭ nawiet bratu, katory taksama staŭ nosa zadzirać i kurażycca. Matka, jak matka, stała pad sakretam Adamu ŭhawarywać, chwaliła šlachcianku, to swaryłasia na jaho, to płakała.

— Synok moj, — kazała, — nia hubi nas i siabie nie panižaj.

— Čymža ja was zhubiŭ? Kania kupiŭ, bryčku sprawiŭ, a mamie, a Kustusi mała čaho ŭsialakaha nakuplaŭ? A z chatniaha i kapiejki nie biaru i nie patrabuju.

— Alež Treciačyška biez pasahu, dy z takoj familii!...

— Ja chaču mieć žonku, a nie pasah. Šlachcianka maje pasah, ale rozumu joj nie chwataje: jana ŭmieje tolki śmiajacca; ja heta zrazu prymieciŭ, a raboty swajej nie pakazała. Usio pakuplaŭ baćka. Błahaja familija nie biada; u Amerycy na heta nie hladziać. Čym Traciak horšyja za Jakubielaŭ? Boh roŭny baćka ŭsim ludziam.

— Adamka, apomnisia! Baćka kaža, što błahasławienstwa nia daść.

— Jak nia daść, dyk i tak budzie. Ja baćku kryŭdy nie zrabiŭ, a žanicca mianie prymusić nia maje prawa. Chto mnie sudžany, tuju i waźmu.

Karusia prabawała krychu ŭniać staroha, ale toj byŭ ćwiordy, jak kamień, i čuć staroj nie addubasiŭ. Chadziła Karusia i da Agaty ŭdawy, na Barunskuju wulicu, kab kinuć na karty; zaniesła kryšku muki i skwaračku, bo Agata hrošaŭ nia brała. Karta pakazała pamysna: warażyłasia, što Amerykancu sudžana rusaja, maładaja, i Karusia ŭściešyłasia, što heta na šlachcianku padchodzić, tymbolej, što Agata kazała: „budzieš z jaje rada.“ Pryjšoŭšy da chaty, Karusia ŭspomniła, što i Treciačyška maładaja i rusaja, dyk jašče horš zasmuciłasia i spałochałasia. Tyki niawytrywała: dawaj iznoŭ hawaryć sa starym.

— Michał, a što budzie, jak Adam biez našaha błahasławienstwa aženicca?

— Ja ŭžo wiedaju, što budzie, tabie i dzieła niama.

— Jakto „dzieła niama,“ a ci ja jamu nia matka, ci ja ŭžo ŭ was ničoha?

— Dyk miarkuj ty sama, durnaja ty haława, što twoj Amerykaniec ciabie nia pytajecca i nasuproć našaj woli biare Treciačyšku, kab zapahanić našu familiju.

— Boža, źlitujsia! i čahož jana da nas pryčapiłasia? — zahałasiła Karusia.

Stary Michał widać byŭ niešta zadumaŭšy. Adzin raz skazaŭ małodšamu synu ŭ sakrecie.

— Ty, Franuk, nia bojsia: ja ciabie nia skryŭdžu.

I Franuk paturaŭ baćku, jak umieŭ.

нацыяй дзеля разьбіваньня беларускага народнага руху, усьцяж разваліваецца. Посьле выхаду з яго Акінчыца, вышаў адтуль (25. V. 31.) так-жа і Я. Станкевіч з сваім „Гаспадарскім Зьвязам“. Такім чынам у „Цэнтрасаюзе“ асталася толькі „свая“ кумпанія з некалькі асоб.

„Праўда“. Пад такім загалоўкам Ф. Акінчыц, быўшы грамадавец, а цяпер палёнофіл, з такімі-ж быўшымі грамадаўцамі, а цяпер палёнофілямі Луцкевічам і Астроўскім „нечага“ не падзяліўшы, выдаў аднадзёўку (30.V.1931), у якой нябывала чорнымі фарбамі рысуе характэрыстыку прадусім Луцкевіча, як чалавека і як палітыка. Аднадзёўка гэта шмат паказала цікавага грамадзянству: ясна — між іншым — выявіла справу польскай грашовай „дапамогі“ для Луцкевічаўскіх санацыйных „арганізацыяў“ з палітычна-дыспозыцыйнага фонду. Кожны дасьледчык адраджэнскага беларускага руху, а так-жа і думаючае беларускае грамадзянства над аднадзёўкай Акінчыца прызадумацца мусіць.

З украінскага жыцьця.

30-ыя ўгодкі Мітрапаліта Андр. Шэптыцкага на мітрапалічым прастоле ў Львове ўрачыста сьвяткуе ўсё украінскае грамадзянства. Сьвяточная акадэмія ў прысутнасьці самога Юбілянта адбылася 7 г. м. у Львоўскім гарадзкім тэатры і ў м.Беразанах. Ад Беларусаў юбілейныя пажаданьні злажыў на асобнай аўдыенцыі інж. Ад. Клімовіч.

З Польшчы.

Памёр віц.-марш. Сойму Ян Домбскі. Дня 5 г. м. ў Варшаве памёр павадыр „Строн. Хлопскага“ — віц. маршалак Сойму Ян Домбскі.

Ян Домбскі ў 1920 годзе быў старшынёй польскай дэлегацыі на мірным дагаворы Польшчы з С.С.Р.Р. у Рызе і ад імя Польшчы падпісаў ведамы Рыжскі трактат.

Забастоўка трамвайшчыкаў. У мінулым тыдні ў Варшаве забаставалі ўсе трамвайшчыкі. Прычына забастоўкі — звальненьне 400 работнікаў з пасадаў. Пасьля забастоўкі трамвайшчыкаў забаставалі работнікі электроўні і аўтабусаў. Агулам забаставала некалькі тысяч работнікаў.

Школьная забастоўка немцаў на Памор'і. Польскія школьныя ўлады хацелі скасаваць навучаньне панямецку пратэстанскай рэлігіі на Памор'і, але немцы проціў гэтага рашуча выступілі ў абароне роднай мовы. У выніку школьны інспэктар у Свеці загадаў вярнуць правы нямецкай мове, дзеля навучаньня ёю нямецкіх дзяцей іхняй рэлігіі.

З заграніцы.

Спор фашыстаў з Апостальскай Сталіцай і прычыны гэтага спору. Апошнімі часамі газэты падаюць шмат вестак аб непаразуменьні ў Італіі фашыстаў з Апостальскай сталіцай. Прычын гэтых непаразуменьняў ёсьць дзьве: 1) узгадаваньне і арганізацыя каталіцкай моладзі, 2) работніцкія справы.

Фашысты глядзяць на моладзь, як на матэр'ял для ўзгадаваньня і павялічаньня сваей партыі, затым хочуць узяць узгадаваньне гэтай моладзі ў свае рукі і пакіраваць у пажаданым для сябе кірунку, гэта значыць, прывучыць яе падпарадкавацца прадусім партыйным загадам, а не рэлігійным і напаіць іх дзікім фашыстаўскім нацыяналізмам. Апостальская Сталіца з такімі паглядамі і імкненьнямі фашыстаў згадзіцца ня можа і затым абстаівае, каб у школах існавалі побач з фашыстаўскімі арганізацыямі моладзі такжа рэлігійныя, каталіцкія. Фашызм, як ведама, не пераносіць побач з сабою ніякай іншай арганізацыі і дзеля таго фашыстаўскі ўрад пазакрываў усе каталіцкія арганізацыі моладзі, якія дагэтуль існавалі.

Гэта была першая прычына непаразуменьня паміж Апостальскай Сталіцай і фашызмам.

Другая прычына — гэта работніцкая справа. Цяперашні папеж Піус XI выдаў, так як адзін з яго папярэднікаў — Лявон XIII, энцыкліку аб работніцкай справе, дзе дамагаецца большай справядлівасьці для працоўных масаў. Фашысты абурыліся: якто? Апостальская Сталіца сьмее гаварыць аб справах працоўных масаў, як аб нейкай праблеме, каторую трэба разьвязаць! То-ж яны, фашысты, ужо даўно разьвязалі гэтую справу, а тут папеж ізноў яе падымае і дамагаецца разьвязаньня! У зьвязку з выступленьнем Апостальскай Сталіцы ў абароне каталіцкіх арганізацыяў моладзі, а такжа выданьнем энцыклікі ў справе працоўных масаў і наагул грамадзкіх справах паўстала вялікае нездаваленьне ў радох фашыстаў. Аднак Апостальская Сталіца асталася цьвёрдай у сваіх праканаваньнях, а папеж нават публічна заявіў, што „могуць ад нас забраць жыцьцё, але ня прымусяць нас, каб мы маўчалі“.

Да чаго давядзе гэты спор паміж Апостальскай Сталіцай і фашызмам — пакажа будучыня.

Да нас пішуць:

УРАЖАНЬНЕ З БЕЛАРУСКАГА ПРАДСТАЎЛЕНЬНЯ.

Вялікая Бухаўшчына, Нясьвіскага пав. Наша молазь на Ушэсьце 21.V. с. г. зладзіла беларускае прадстаўленьне на карысьць незаможных вучняў Клецкай Беларускай гімназіі. У гэты самы дзень такія-ж беларускія прадстаўленьні адбыліся і ў ваколічных вёсках: Ванілавічах, Бабаевічах, Лукаўцах і Сякерычах. Гэтае прадстаўленьне на карысьць незаможных вучняў падняло дух нашага сялянства, якое хоць і беднае, але свой грамадзкі абавязак сумленна выканала ахвяроўваючы па некалькі грошаў на сваю будучыню — для моладзі вучнёўскай. З аднае нашае вёскі аддалі ў Клецкую Бел. Гімназію чыстага даходу ад прадстаўленьня 23 злоты 95 гр. Апрача гэтага, наладжанае беларускае прадстаўленьне для беларусаў і на карысьць бедных вучняў узбагаціла некаторых у пачуцьцё любасьці да роднай культуры і свайго народу. Ахвярная праца ў ладжаньні гэтага прадстаўленьня І. Мартышэнкі і інш. сталася зразумела ацэненай многімі, а гэта ўжо вялікі крок уперад.

Зорка.

НЯДОБРАЕ СУСЕДЗТВА.

Міроўшчына, Навагрудзкага пав. Нашага двара зямля гранічыцца з многімі вёскамі. Суседзтва гэнае з панскім дваром сялянам вельмі прыкрае. За найменшую „шкоду“ на дворным полі сяляне мусяць тлумачыцца прад судом. А цяпер дык двор забраў у „плен“ і вясковую сенажаць, да якой трэба даяжджаць праз дворны лес. Пан Стравінскі забараніў нават і пехатой каня вясьці на гэную сенажаць лясной сьцежкай, якая вядзе на луг праз дворны лес. Другой-жа дарогі на гэтую сенажаць, па якой можна было-б даехаць або пераганяць жывёліну, няма. Дык цяпер гэты вясковы луг апынуўся ў „плене“ дворнага лесу. Блага людзі робяць, выкарыстоўваючы права на шкоду другіх, забываючыся, што справядлівасьць усюды дамагаецца любові бліжняга.

ЦЯЖКАЯ ВЯСНА.

Гора ў нашых вёсках і толькі. Зямлі мала, заработкаў няма, а жыць трэба. Скупаваты ўраджай мінулага году пасьля доўгай і марозьлівай зімы вельмі цяжкай зрабіў сёлетнюю вясну. У многіх не хапіла нават насеньня на пасеў веснавы, а купіць няма за што, бо няма дзе зарабіць. Вот і рабі што хочаш. А да гэтага сэквэстратары не даюць забывацца селяніну, што і падаткі трэба плаціць, якія ў нас, як на нашы сялянскія гаспадаркі, за вялікія. Калі ня будзе ў скорай будучыне справядлівай рэформы рольнай, дык на нашай вёсцы сусім спралетарызуецца сялянства. А гэта будзе на руку камуністым.

Сьлёзнавокі.

НЕ МАРНУЙМА ГРОШАЙ НА ГАРЭЛКУ І ЧАСУ НА ПУСЬЦЯЧЫНУ!

Чэрлонка, Горадзенскага пав. Наша моладзь ужо апамяталася, што ня можна марнаваць грошай на гарэлку і часу на пусьцячыну. Сьпярша выпісала родную газэту, а пасьля 60 беларускіх кніжак і занялася прасьветай. Але гэта зразумелі ня ўсе, бо ёсьць яшчэ такія, што кажуць — няма часу чытаць газэт і кніжак, а на куплю іх шкада грошай. Тымчасам гэтыя „ня маючыя часу“ на чытаньне газэт і кніжак вельмі часта марнуюць час на пусьцячыну, як ігру ў карты, а грошы аддаюць на дурман — гарэлку.

А. М.

ХВАЛЯЦЦА ПОЛЬСКАЙ КУЛЬТУРАЙ.

Вішнева, Вялейскага павету. Каля нас усе школы польскія і вучыцялі вучаць беларускіх дзяцей папольску. Пабеларуску нашы людзі вучацца самі праз сябе — выпісываюць газэты беларускія, купляюць беларускія кніжкі і гэтак вучацца. Але і гэтак вучыцца пабеларуску ёсьць перашкоды. Акуратна нумар за нумарам трудна газэты атрымаць праз пошту, а ў вёсцы заўсяды вучыцель склікае ў „звёнзак“ ці „кулко“ і там паказвае польскую культуру. Ведама, да нашага чалавека польская культура не прыстае, але як вучыцель ёй хваліцца, выстаўляючы яе на паказ, дык паглядзець ня шкодзіць. Ведама, што вучыцялі паказваючы нам польскую культуру хочуць, каб мы яе прымалі і перараблялiся на палякоў, але дзеіцца сусім наадварот. Нашы людзі, пабачыўшы польскае прадстаўленьне або пачуўшы нешта аб Польшчы, шукаюць у беларускіх кніжках і газэтах гістарычных фактаў і добрых навінаў аб беларусах і Беларусі. Дык вось так нашы людзі вучацца самі праз сябе пабеларуску, а польскія вучыцялі вучачы нашых дзяцей папольску хваляцца прад намі польскай культурай.

Вішнеўскі.

КРЫХУ АБ ЖЫЦЬЦІ КАЛЯ НАС.

Іказьнь, Браслаўскага пав. Даўно ўжо я пісаў аб жыцьці сялян у нашым павеце. Але і цяпер няма чым пахваліцца. Стогнуць нашы людзі пад цяжарам жыцьця і паправы ня відаць. Работы нідзе ніякай, а безработных тысячы людзей. Зімою ўсе гатовіліся на заработкі ў Латвію на вясну, выраблялі дакуманты—„довуды особістыя“— і чакалі адкрыцьця граніцы на выезд у Латвію. Прышла вясна, прышоў м-ц травень з цёплай сонечнай пагодай, а заработкаў, як ня было так і няма. Прыяжджаў у Браслаў нейкі агент па работнікаў у Латвію, але што з таго, калі ён узяў толькі некалькі жанчын, а народу папёрла да агента тысячы. Пасьля гэтага нашы людзі і надзею страцілі на заработкі.

Мне здаецца, што нам трэба шукаць работы ў сваей хаце. Трэба дамагацца, каб правялі справядліва рэформу рольную—надзялілі сялян адпаведнай колькасьцяй зямлі, каб кожная сям'я мела свой рольны варштат працы і на ім зарабляла сабе на жыцьцё. Нам да гэтага трэба імкуцца, а не пацяшаць сябе зімой веснавымі заработкамі ў Латвіі ці дзе ў іншым краю і заўсяды аставацца бяз нічога.

К—к.

КУЛЬТУРНАЯ ПРАЦА.

Браслаўскі павет. Дня 24.V. с. г. беларуская моладзь пад кіраўніцтвам вучыцелькі Шаўлянскай беларускай школы М. Булыгавай у в. Шаўлянах зладзіла беларускае прадстаўленьне, а 31.V. такое-ж прадстаўленьне адбылося ў в. Галубоўшчыне.

На беларускія прадстаўленьні зьяжджаюцца людзі з далёкіх ваколіц. Беларускімі народнымі песьнямі і дэклямацыяй беларускіх вершаў маладыя артысты-аматары будзяць народ да нацыянальнага жыцьця. Пасьля такога прадстаўленьня ўзбуджаецца пад'ём духа да працы на ніве народнага адраджэньня, асабліва гэта заўважыць можна сярод моладзі.

Я. Б.

Чытайце і пашырайце

„Беларускую Крыніцу!“

Ab haspadarcy.

Haspadarka ŭletku.

Pačatak leta (m-c červień) musić być vykarystany na dakančańnie spoźnienaj siaŭby i sadźby (lon, bulba i inš.). Usio-ž zasiejenaje i zasadžanaje musić być dalej dahladana; pieliva nikoli nia moža być za šmat. Akopniny (bulba, buraki) aprača taho treba ŭ čas aboryvać i hakavać. Nia ściahivać z pracaj u papary, kab paśla mahčy ŭ čas pajšci na sienakos i žnivo. Papar apraŭdyvaje siabie naahuł tolki na hruntoch kiepska abroblenych, a hałoŭnaje — zarosšych ziellem. Takoje pole, pakinienaje pad papar, treba ciapier miełka ŭzarać (padłuščyć i zaraz-ža vałavać (vałam) i baranavać. Vałavańnie i baranavańnie možna i treba adłažyć, kali-b ziamla była mokraj: treba tady pačakać, pakul vysachnie. Ciapier taksama miejsca i para pravodzić u papary vapnavańnie zakisłych hruntoŭ, jakija prad tym adnak musiać być asušany ad nadbytku vady. Hrunty ŭ dobraj kultury (dobra pahnojenyja i abroblenyja) pakidać pad papar nielha, bo heta prynosić stratu. Na Kupalle končycca haspadarska-ziemlarobski hod: ciapier treba rabić padrachunki, paraŭnańni, padličać zapasy— ich ciapier najmienš i tamu najlahčej padličyć i ŭkładać plany na budučyniu.

Zaraz-ža za pracaj u papary prychodzić sienakos. Usie dobryja haspadary ćvierdziać, što sienakos musić być da Kupalla (24 červienia) skončany. Na zmahańnie z škodnym ziellem musić być źvierniena asablivaja ŭvaha, bo vialikija straty maje z hetaha ziemlarob. Jak ab sienakosie, tak i ab zmahańni z škodnym ziellem u poli bolš padrobna skažam dalej.

U mižčasie daśpiavaje ŭžo ŭ poli i zbožža, jak azimaje, tak i jaravoje. Pryhatavać siarpy i kosy. Chto-b chacieŭ, — a chacieć musić kožny — padabrać z svaich zasievaŭ dobruju siaŭbu, toj musić u čas abchadzić svajo pole i padhladać, dzie jošć dobra raźvitaje kałośsie. Heta kałośsie treba dobra daśpielić, asobna sabrać (sastryhčy) i vykryšyć ziarniaty z siaredziny kołasu. Čym bolšaje i lepš raźvitaje ziernie, tym lepš; vyniatak tolki jošć u žyta, dzie najbolšyja ziarniaty zvyčajna pachodziać z h. zv. zubatych kałasoŭ i ŭ takija-ž kałasy raźvivajucca. A zubaty kołas, z redkimi i niaroŭna nasadžanymi ziarniatami,—heta peŭnaja haspadarčaja strata... Hetak pastupajučy možna dahadavacca (za paru hadoŭ) lepšaha siaŭbovaha nasieńnia, čymsia kuplajučy jaho za darahija hrošy!... Taksama pastupajecca i pry vybary nasieńnia travaŭ (napr. lisachvost i inš.). Dobruju bulbu na nasieńnie vybirajecca hetak: lepšyja i zdarovyja kalivy zaznačajucca pobač paŭtykanymi małymi kałočkami, ci ščepkami. Hetak aznačanyja kalivy ŭvažna śpielacca, asobna kapajucca i pierachoŭvajucca.—Z žnivom žyta treba pačynać, jak tolki ziernie jahonaje łomicca praz paznohać. U časie žniva ścierahčysia pić syruju ściudzionuju vadu: lepš, zdaraviej i bieśpiačniej užyvać da hetaha chlebnaha kvasu. Koniaŭ ścierahčy treba ad źjadańnia žytnich kałasoŭ, bo ad hetaha mohuć jany nabavicca niebiaśpiečnaj chvaroby. Naahuł karmić kania žytam možna tolki ŭ patrebie (pry niastačy aŭsa), dy i to dajecca žyta močanaje. Sušyć pažataje, abo pakošanaje zbožža treba staranna, asabliva pažataje nizka z travoju; jačmień musić „vypacicca.“ Na nieŭzaranym aržyščy jošć šmat vysypanaha zbožža, a na ŭzaranym — roznych žukoŭ i rabakoŭ: na ŭsio heta treba pryvazić, ci prynasić u pole kurej. —

Pakošanaje abo pažataje zbožža treba zaraz-ža sastavić radami ŭ kopki, a aržyšča, kali ŭ jaho z viasny jšče nia była ŭsiejena seradela, ci što inšaje, pahnaić kainitam, miełka ŭzarać i zasiejać, abo aržyščanaj repaj (na lahčejšych pierahnojach), abo matylkovymi raścinami. Zasievy pry normalna suchoj hlebie vałujucca ciažkim hładkim vałam. Źlivajučyjasia i ssychajučyja paśla navalnicy hleby treba pry akopninach (bulba, burak) uzoryvać, a pry kałasistych zbažžavinach — baranavać, abo vałavać.

Ad pałovy m-ca žniŭnia (Aspaža) treba miašać pad aziminy. Hnaić chlaŭnym hnojem možna tolki ŭ razie kaniečnaj patreby. Hnoj pry hetym musić być pierapreŭšy i drabniutka rukami rastresieny. Adnačasna treba pryhataŭlać (małacić, čyścić, bajcavać) nasiennaje zbožža na zasievy azimin. U hetym-ža časie (15.VIII) sieicca azimaja kasmataja vika (vicia villosa), jakaja jošć vielmi dobrym ranna-viaśnianym kormam dla skaciny.—Dobra dojnaj karovie nie škadavać treba ŭvieś čas „dadatkaŭ:“ dobraj zialonaj travy, otrubaŭ, a dla cialat — aŭsa. Usiu žyviolinu treba ścierahčy ad dakučlivych i časta zarazu raznosiačych much: chlavy čyścić, vietryć i bialić vapnaj.

Zapas jajak, jakija ŭletku zvyčajna byvajuć tannymi, treba konservavać na zimu ŭ vapiennaj vadzie, abo ŭ h. zv. vadzianym škle. Paśpiavajučyja sadovyja frukty i jahady treba taksama ciapier sušyć, abo pierarablać na marmeladu i kanfitury: kaštuje heta ciapier mały hroš, a reč vielmi dobraja.

inž. A. K.

Да беларускага грамадзянства.

У вапошнім часе ў польскай прэсе сталі зьяўляцца газэтныя інфармацыі аб Клецкай Беларускай гімназіі, якія ў цэлым не адпавядаюць сапраўднасьці, а ў некаторых выпадках зьяўляюцца злоснымі вымысламі іх аўтараў. Газэтныя інфарматары падаюць да ведама грамадзянства, што Кураторыюм адабраў у гімназіі канцэсію на 1931-1932 шк. год, што быўшай у тэй справе ў Куратара дэлегацыі ад гімназіі куратар даў непамысны адказ, што ў гімназіі вядзецца камуністычная прапаганда, што многія з вучняў гімназіі належаць да камуністычнае партыі, што за час свайго існаваньня гімназія ўзгадавала больш за 20 камуністаў, антыпанствовая дзейнасьць якіх сьцьверджана судом і якія пасьля гэтага зьбеглі ў Савецкую Расею,—у рэзультаце чаго і сталася адабраньне ў гімназіі канцэсіі на 1931-32 шк. год.

У мэтах высьвятленьня праўды Управа Бацькаўскага Камітэту і Дырэкцыя Гімназіі падаюць да ведама беларускага грамадзянства, што да апошняга часу ні судом, ні паліцыйнымі ўладамі ня сьцьверджана, каб гімназія вяла камуністычную прапаганду, ці каб хто з вучняў гімназіі належаў да камуністычнае партыі, ня ведама гімназіі і тое, каб хто з яе вучняў, унікаючы кары за сваю проціўдзяржаўную дзейнасьць, зьбег у Савецкую Расею, а дзеля гэтага інкрымінаваныя гімназіі праступкі не маглі быць для Кураторыюму падставай для адабраньня ў гімназіі канцэсіі. Канцэсія на 1931-32 школ. год не магла быць адабранай у гімназіі і таму, што гімназія яе ня мела. За сваё сямёхгадовае існаваньне гімназія атрымоўвае канцэсію на адзін год і ў гэтым годзе ніякіх крокаў у тэй справе яшчэ не рабіла і ніякай дэлегацыі да куратара не высылала.

Праўдай-жа ёсьць, што ад заснаваньня гімназіі пэўнымі чыньнікамі з боку польскіх шавіністычных кругоў, а ў апошнія гады і пэўнымі беларускімі угрупаваньнямі робіцца ўсё, каб накінуць на гімназію цень камуністычнага асяродку і тым даць для ўлады падставы для рэпрэсіяў проці гімназіі. Як адным, гэтак і другім тым чыньнікам ходзіць аб адно — каб зачыніць гімназію. Праўдай ёсьць, што ўсякая праява работы тых чыньнікаў на грунце гімназіі спатыкае з боку яе адміністрацыі рэзкі адпор, і замешаныя ў ёй вучні выдаляюцца з гімназіі; выдаленыя ў 1929-30 школ. годзе з гімназіі вучні, з якіх потым некатарыя фігуравалі ў палітычных працэсах апошняга часу, за выняткам аднаго, прабылі ў гімназіі па 5—6 тыдняў, і ня Клецкая гімназія адказвае за іх узгадаваньне.

Ініцыятарам шкодных для гімназіі інфармацыяў, відаць, ходзіць аб тое, каб сваімі вымышленымі інфармацыямі падгатаваць грамадзянства да прыняцьця ім новых рэпрэсіяў проці гімназіі, а мо' і запраўднага зачыненьня яе ўладамі праз адмову ў выданьні канцэсіі на 1931-32 шк. год, як заслужанай гімназіяй кары за нібыто праступную яе дзейнасьць.

За Управу Камітэту:

Грыгор Якубёнак

заст. Старшыні Управы

В. Арэнь

Сэкрэтар Управы

За Дырэкцыю Гімназіі:

А. Макарэвіч

Сп. аб. Дырэктара Гімназіі.

Справаздача

Управы Бацькаўскага Камітэту Клецкай Беларускай Гімназіі з адбыўшагася ў днях 13-20 красавіка г. г. збору ахвяр на карысьць бяднейшых вучняў гімназіі.

Збор ахвяр адбыўся на тэрыторыі Нясьвіскага павету пры пасрэдстве падпісных лістоў. Прыпаўшае на час збору поўнае бездарожжа перашкодзіла зборшчыкам ахвяр выкарыстаць поўнасьцю данае ім права збору. Большая частка павету засталася неабойдзенай імі — гміны Гарадзейская, Сноўская, Сіняўская і Ланьская былі толькі закрануты, а Гавезьнянская і Заастравецкая і зусім незачэплены.

З выпушчаных 21 падпісных лістоў выкарыстаны фактычна 18 лістоў, па якіх сабрана: гатоўкай 511 зл. 94 гр. і прадуктамі і матэр'яламі натурай на 281 зл. 80 гр. Расходавана на арганізацыю збору 19 зл 45 гр. Сабраныя прадукты ў частцы (на 49 зл 27 гр.) выданы ў натуры бяднейшым дзецям гімназіі, а рэшта продана за 232 зл. 53 гр.. Чысты даход ад збору ў гатоўцы 725 зл. 02 гр. перададзены Дырэкцыі гімназіі, як плата за навуку за бяднейшых дзяцей.

Падаючы аб гэтым да ведама агулу ахвярадаўцаў і ўсяго беларускага грамадзянства, Управа Камітэту выражае шчырую падзяку, як зборшчыкам ахвяр, гэтак і ўсім ахвярадаўцам, што адгукнуліся на заклік Камітэту Гімназіі і пасільнымі ахвярамі прышлі з дапамогай бедным дзецям гімназіі

26. V. 1931 г.

м. Клецк.

Заст. Старшыні Управы Бацьк. Камітэту

Г. Якубёнак.

Сэкрэтар Управы

В Арэнь.

Наша пошта.

Бацькаўскаму К-ту Клецкай Беларускай гімназіі. Справаздачу і пісьмо атрымалі і ў гэтым нумары зьмяшчаем.

Дырэкцыі Навагрудзкай Беларускай гімназіі. Абвестку атрымалі за позна і як неактуальнай ужо не зьмяшчаем. Просім падаць вынік матуральных экзаменаў, за што згары дзякуем.

Ярмалковічу. Надрукуем у наступным нумары лацінкай.

К-ту. Атрымалі, дзякуем, карыстаем.

Іванчыку. Ня можам зразумець, які Вам патрэбны журнал. У гэтай справе зьвярніцеся да кнігарні „Пагоня“ — Вільня, Людвісарская 1.

Сьлёзнавокаму. Дзякуем, карыстаем, просьбу спаўняем. Дамагайцеся газэты на пошце.

Бурдукевічу. Газэту Вам пасылаем акуратна, трэбуйце на пошце. Грошы 3 зл. атрымалі і запісаны на Ваш рахунак.

А. М. Атрымалі, дзякуем, скарыстаем, пішыце больш.

Вішнеўскаму. Атрымалі, карыстаем, пішыце аб жыцьці ў вашых ваколіцах.

Мартышонку. Газэту Вам пасылаем акуратна, трэбуйце заўсяды газэты на пошце. Калі Вы атрымліваеце хоць праз адзін нумар, дык і гэта ёсьць доказам, што рэдакцыя Вам пасылае акуратна, бо газэты пасылаюцца на карты прэнумэраты, якой Вы і трэбуйце на пошце. Так-жа адказваем на пісьмы ў „нашай пошце“. Бракуючыя нумары Вам высылаем, але Вы лепш дамагайцеся газэты на пошце. З прысланага карыстаем і дзякуем, пішыце часьцей.

Булыгу. Атрымалі, дзякуем.

Сэкрэтару Бел.-Амэрык. Нац. Саюзу. Ваша паведамленьне прыймаем пад увагу.

Дальшэўскаму ў Францыі. Атрымалі, дзякуем, скарыстаеж, пішыце часьцей. Просьбу споўнілі.

Вясковаму Беларусу. З карэспандэнцыі скарыстаем, дзякуем, пішыце больш.

Райгонку. Пісьмо і 2 зл. атрымалі, дзякуем, газэту пасылаем.

Аляшкевічу К. Атрымалі, дзякуем надрукуем, пішыце часьцей.

Вясковаму. Атрымалі, скарыстаем.

Павалковічу. Газэту пасылаць будзем.

Выпісывайце беларускія кніжкі па адрасу: Кнігарня „ПАГОНЯ“ — Вільня, Людвісарская 1.

Рэдактар Янка Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец А. Шутовіч